

«Як ацаніць атрыманы вынік на ЦТ? Зразумела, што 7 балаў — гэта вельмі дрэнна, а 100 балаў — проста недасягальна. А 40 ці 50 балаў — які гэта ўзровень? Лаяць ці хваліць дзіця за гэта? Невядома...» СТАР. 2



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

31 КАНАЛ

У сярэдзіне трыццатых гадоў «Звязда» наладжвае супрацоўніцтва з пісьменнікамі. Яны праглядаюць нумары газеты, рыхтуюць агляды стану мовы газеты, выказваюць свае прапановы. СТАР. 6

95 ЗВЯЗДА

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 чэрвеня 2012 г. ПЯТНІЦА № 124 (27239) Кошт 1200 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ПРЭЗІДЭНТЫ БЕЛАРУСІ І ЭКВАДОРА ПОЎНЫЯ РАШУЧАСЦІ ЗНАЧНА РУШЫЦЬ НАПЕРАД У ДВУХБАКОВЫХ АДНОСІНАХ

**Прэзідэнты Беларусі і Эквадора Аляксандр Лукашэнка і Рафаэль Карэа Дэльгада поўныя рашучасці значна рушыць наперад у двухбаковых адносінах. Такую пазіцыю кіраўнікі дзяржаў пацвердзілі ўчора на сустрэчы ў Кіта, перадае БЕЛТА.**

Гаворачы аб эканамічным складальніку адносін, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яго выражэннем з'яўляецца тавараабарот. «Ён наогул нікчэмны, калі браць патэнцыял нашых дзяржаў», — сказаў беларускі лідар. Прэзідэнт Беларусі лічыць, што дзвюм дзяржавам пад сілу яго павялічыць.

«У нас абсалютна няма закрытых тэм для перагавораў, і мы гатовы выканаць любую вашу просьбу, калі зможам гэта зрабіць. Навука, новыя тэхналогіі, асобныя напрамкі арганізацый эканомікі — усё, што вас зацікавіць, мы з задавальненнем вам пакажам. І калі вам будзе выгадна, то мы дапаможам перанесці той вопыт Беларусі, які мы маем, на эквадорскую зямлю», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

У сваю чаргу Прэзідэнт Эквадора лічыць, што гэты візіт кіраўніка беларускай дзяржавы ўмацуе дружалюбныя адносіны паміж дзвюма краінамі. «Мы вельмі рады, што вы знайшлі магчымасць наведаць Эквадор у час вашай паездкі па Лацінскай Амерыцы. Нам вядома пра Беларусь, што яна з'яўляецца высокаразвітой краінай, мае высокія тэхналогіі, займае сваё трывалае месца ў свеце», — сказаў Рафаэль Карэа Дэльгада.

Прэзідэнт Эквадора выказаў зацікаўленасць у атрыманні тых тэхналогій, якімі валодае Беларусь. «Мы ведаем, што Беларусь з'яўляецца краінай з высокаразвітой навукай, тэхналогіямі, прамысловасцю. Нам неабходны новыя тэхналогіі, таму мы хацелі б даведацца, што Беларусь магла б нам прапанаваць у галіне навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва», — адзначыў ён.

Рафаэль Карэа Дэльгада лічыць, што Эквадору таксама ёсць што прапанаваць беларускім спецыялістам у гэтай сферы. «Мы маем самую вялікую ў свеце лабараторыю, якой з'яўляецца Амазонская сельва. Гэта вельмі вялікі натуральны ўніверсітэт, і мы выступаем за тое, каб беларускія спецыялісты маглі таксама прыязджаць сюды і займацца тут навуковымі даследаваннямі», — сказаў ён. Акрамя таго, паводле слоў Прэзідэнта Эквадора, у краіне ствараецца ўніверсітэт па навукова-тэхналагічных даследаваннях. Рафаэль Карэа Дэльгада лічыць, што ў гэтым плане Беларусь магла б таксама вельмі дапамагчы Эквадору.

«Такім чынам, усё гатова да нашай сумеснай работы, — адзначыў Прэзідэнт Эквадора. — Нам трэба вельмі шмат зрабіць, асабліва што датычыцца гандлю». Прэзідэнт Эквадора са шкадаваннем заўважыў, што, нягледзячы на 20-гадовую гісторыю дыпламатычных адносін, краіны не змаглі рушыць да канкрэтнага развіцця. «Мы хочам, каб гэты візіт стаў новым пунктам адліку ў адносінах паміж Беларуссю і Эквадорам», — падкрэсліў ён.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы ў Кіта са сваім эквадорскім калегам, запрасіў Рафаэля Карэа Дэльгада наведаць з візітам Беларусь. «Наша супрацоўніцтва будзе вельмі эфектыўным і дынамічным, калі вы пабываеце ў Беларусі і самі ўбачыце ўсё тое, што мы маем», — лічыць беларускі лідар. «Гатовы вас у любы час сустракаць у Беларусі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што ў яго паездцы па краінах Лацінскай Амерыкі візіт у Эквадор займае асаблівае месца, паколькі ў іншых краінах, якія ён наведваў цяпер, раней неаднойчы бываў. Аляксандр Лукашэнка таксама расказаў, што ў яго ёсць і асабісты інтарэс, паколькі, займаючыся гісторыяй, шмат увагі ўдзяляў вывучэнню гэтага рэгіёну. «Я шмат прачытаў пра краіну напярэдадні гэтага візіту, але тое, што ўбачыў, шчыра скажу, мяне вельмі ўразіла і найперш гэты ўнікальны горад — ваша сталіца», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. «Упэўнены, што гэта не апошні візіт у Эквадор», — дадаў беларускі лідар.

## БЕЛАРУСЬ ЗАКЛЮЧЫЛА З ВЕНЕСУЭЛАЙ КАНТРАКТЫ НА $5 МЛРД

**Беларусь і Венесуэла плануюць у бліжэйшыя гады рэалізаваць сумесныя праекты агульным коштам амаль $5 млрд. Аб гэтым, каментуючы дакументы, падпісаныя ў ходзе візіту ў Каракас Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, заявіў журналістам першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка, паведамляе БЕЛТА.**

«Падпісаныя ў ходзе візіту 24 дакументы прадугледжваюць сумарны іх кошт каля $5 млрд», — сказаў Уладзімір Сямашка. Так, рэалізацыя кантракта на будаўніцтва ЦЭЦ магутнасцю 600 МВт у прамысловай зоне Санта Інес прадугледжвае фінансаванне ў аб'ёме $1 млрд 280 млн. Таксама падпісана пагадненне на праектаванне і будаўніцтва газаправода Баркісімета-Барынас працягласцю 260 км. Праект ацэньваецца ў $300 млн. «Мы дамовіліся развіваць газавы напрамак нашага супрацоўніцтва, выкарыстоўваючы спадарожны пры здабычы нафты газ па розных напрамках», — заявіў Уладзімір Сямашка. Размова ідзе аб пераводзе аўтамабіляў на газаматорнае паліва. Беларускімі спецыялістамі ўжо газіфікаваны мікрараён Сукрэ венесуэльскай сталіцы, дзе пражывае 2 млн жыхароў.

## ЯЎГЕНАВЫ РУЧНІКІ

**ЯЎГЕН Маркевіч з Ліды — студэнт 3-га курса Гродзенскага дзяржаўнага медуніверсітэта — стварыў 200 ручнікоў, 20 дываноў, саткаў 120 палотнаў. Ткацтвам Яўген пачаў займацца ў 9 класе. Калі гасцяваў у бабулі, залез на гарышча, знайшоў станок, стала цікава. Цяпер Яўген адраджае старажытныя тэхналогіі, аднаўляе найскладанейшыя ўзоры. З палатна, сатканага ім, работнікі Лідскага раённага цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры «Спадчына» аднаўляюць аўтэнтычныя нацыянальныя касцюмы Лідскага рэгіёна, посцілкі, ручнікі, сурвэткі, паясы. Са створанай ім тканіны пашыта восем народных строяў, якія прадстаўляюць розныя раёны Гродзенскай вобласці.**

**БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ЛАДУЦЬКА, старшыня Мінскага гарвыканкама:**

***У гэтым годзе плануем яшчэ адно нязначнае павышэнне кошту праезду ў гарадскім транспарце. Гэтае павышэнне будзе ўкладвацца ў рамкі агульнай стратэгіі эканомікі рэспублікі. Зараз транспарт горада датуецца з бюджэту на 60%, такі ж узровень датацыі захаваецца ў далейшым, хоць гэта вельмі высокія расходы з бюджэту.***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 22° |
| Віцебск | + 18° |
| Гомель | + 20° |
| Гродна | + 20° |
| Магілёў | + 19° |
| Мінск | + 19° |

## КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ПРАДАСТАВЯЦЬ ДЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯЎ САМЫ РЭЙТЫНГАВЫ ЭФІРНЫ ЧАС

**Кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў пятага склікання прадаставяць для выступленняў па дзяржаўным тэлебачанні і радыё самы рэйтынгавы эфірны час з 17.00 да 20.00, калі праграмы збіраюць найбольшую аўдыторыю. Аб гэтым БЕЛТА паведаміў сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай Лазавік, падводзячы вынікі нарады, на якой разглядаліся пытанні выкарыстання СМІ ў перыяд выбарчай кампаніі.**

У розных абласцях час для выступленняў можа адрозніваца ў залежнасці ад колькасці акруг і колькасці зарэгістраваных па іх кандыдатаў. «СМІ будзе прадастаўлена магчымасць для манеўру, каб адкарэкціраваць сетку вяшчання», — сказаў Мікалай Лазавік.

Ён дадаў, што на нарадзе, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі друкаваных і электронных СМІ, абмяркоўваўся праект палажэння ЦВК аб парадку выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў пятага склікання. Дакумент будзе разгледжаны на адным з пасяджэнняў Цэнтрвыбаркама, праінфармаваў Мікалай Лазавік.

Парадак выкарыстання друкаваных СМІ ў час выбарчай кампаніі істотна не змяніўся. У палажэнні будзе прапісана, у якіх газетах кандыдаты ў дэпутаты атрымаюць права публікаваць перадвыбарныя праграмы, аб'ёмы перадвыбарных праграм, тэрміны, у якія іх трэба прадаставіць у рэдакцыі і некаторыя іншыя пытанні. Навацыі закрануць радыё і тэлебачанне — у сувязі з тым, што ў кандыдатаў з'явілася магчымасць удзельнічаць у дэбатах, адзначыў сакратар Цэнтрвыбаркама.

На нарадзе абмяркоўвалася пытанне, у які час і на якіх каналах іх лепш праводзіць. Сумесна з прадстаўнікамі СМІ былі выпрацаваны адзіныя падыходы да арганізацыі і правядзення перадвыбарных выступленняў і дэбатаў кандыдатаў у дэпутаты, агавораны чыста тэхнічныя моманты падрыхтоўкі і запісу выступленняў, арганізацыі дэбатаў.

На гэтым этапе выбарчай кампаніі палітычныя партыі і іншыя рэспубліканскія грамадскія аб'яднанні Беларусі, а таксама працоўныя калектывы, групы грамадзян вылучаюць сваіх кандыдатаў у склад акруговых выбарчых камісій. Згодна з каляндарным планам па выбарах у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу пятага склікання зрабіць гэта яны змогуць да 6 ліпеня ўключна шляхам падачы заявы ў органы, якія ўтвараюць камісіі. Пры гэтым вылучаць можна не больш за аднаго кандыдата ў адну акружную выбарчую камісію.

## СЯРГЕЙ РУМАС АДЗНАЧАЕ РОСТ ПРАМЫХ ЗАМЕЖНЫХ ІНВЕСТЫЦЫЙ У ЭКАНОМІКУ

**Прыток прамых замежных інвестыцый у эканоміку Беларусі расце. Аб гэтым заявіў учора намеснік прэм'ер-міністра Сяргей Румас на пашыраным пасяджэнні пастаяннага камітэта пры Кансультатыўным савеце па замежных інвестыцыях пры Савеце Міністраў Беларусі, перадае БЕЛТА.**

Аб'ём прамых замежных інвестыцый вырас з $450 млн у 2005 годзе да больш як $13 млрд у 2011 годзе. «Прыемна, што ў бягучым годзе гэты рост працягваецца: толькі за студзень-сакавік у рэспубліку паступіла $3,2 млрд прамых замежных інвестыцый, што на 10 працэнтаў больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года», — паведаміў Сяргей Румас.

Прапановы і ініцыятывы бізнэсу і інвестараў улічваюцца пры распрацоўцы мер па паляпшэнні інвестклімату. У прыватнасці, прапановы бізнэс-супольнасці знайшлі адлюстраванне ў праекце закона аб інвестыцыях, змяненнях у Падатковы кодэкс, дэкрэце № 6 і іншых нарматыўных актах.

Віцэ-прэм'ер адзначыў станоўчую ацэнку з боку міжнародных экспертаў тым мерам, якія прымаюцца ў Беларусі для развіцця інвестыцыйнай дзейнасці. Краіна ўваходзіць у тройку найбольш актыўных дзяржаў-рэфарматараў па сукупным эфекце ад лібералізацыі ўмоў вядзення бізнэсу.

■ Надвор'е

## У ВЫХАДНЫЯ БУДЗЕ ГОРАЧА

**У бліжэйшыя выхадныя ў Беларусі будзе горача, паведаміла БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла Парашчук.**

30 чэрвеня, у суботу, халаднаваты паўночна-заходні вецер зменіцца цёплым паўднёва-заходнім. Будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 5-12 градусаў, днём чакаецца 21-28 градусаў, па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці — каля 30. 1 ліпеня вельмі цёплае паветра распаўсюдзіцца на ўсю Беларусь. У асобных раёнах пройдуць кароткія летнія дажджы з навальніцамі. Уначы чакаецца ад 10 градусаў на поўначы да 19 градусаў цяпла па паўднёвым захадзе краіны. Днём прагназуецца 25-32 градусы, па поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцей — каля 35.

У панядзелак захаваецца вельмі гарачае надвор'е, уначы прагназуецца ад 15 да 21 градуса цяпла. У разгар дня чакаецца 27-34 градусы, месцамі па Брэсцкай, Гомельскай і поўдні Мінскай абласцей — 35-36 градусаў. Месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Такая тэмпература на 4-9 градусаў перавысіць кліматычную норму для гэтых ліпеньскіх дзён. 3 ліпеня надвор'е абумовіць маларухомы кантрасны атмасферны фронт. У паўночна-заходніх раёнах спёка пачне спадаць. Там чакаецца дзённая тэмпература 24-26 градусаў, на большай частцы краіны — 29-34 градусы. Па рэспубліцы будуць развівацца магутныя навальнічныя воблакі, месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Пры навальніцах днём шквалістае ўзмацненне ветру, у асобных раёнах ліўні, магчымы град. У сераду спякота аслабее ў многіх раёнах Беларусі.

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.06.2012 г. | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8340,00 | ■ |
| Еўра | 10370,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 253,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1032,37 | ■ |

БЕЛИНВЕСТБАНК
ВРЕМЯ ОТКРЫТИЙ

ИНФОРМИРУЕТ

Наблюдательным советом ОАО «Белинвестбанк» принято решение о закрытии региональных филиалов и о создании на их базе структурных подразделений банка, не имеющих самостоятельного баланса и отдельного банковского идентификационного кода.

С **1 июля 2012 года** на базе Головного филиала по Витебской области ОАО «Белинвестбанк» создается структурное подразделение ОАО «Белинвестбанк» – Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Витебской области.

Установлен следующий режим работы дирекции:
Операционный день по всем операциям:
- для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей:
понедельник – пятница: 8.00 – 17.00, обед 13.00 – 14.00;
- для физических лиц:
понедельник – пятница: 8.00 – 19.30;

Банковский день по обслуживанию:
- юридических лиц и индивидуальных предпринимателей:
понедельник – пятница: 9.00 – 15.30, обед 13.00 – 14.00;
- физических лиц:
понедельник – пятница: 9.00 – 19.00;
суббота: 9.00 – 16.30.

Всем клиентам Головного филиала по Витебской области ОАО «Белинвестбанк» сообщаем о том, что наше сотрудничество будет продолжаться на условиях ранее заключенных договоров.

Телефоны для справок – (0212) 29 75 01, 29 75 79

Контакт-центр – 146

www.belinvestbank.by

Открытое акционерное общество
«Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк».
220002, г. Минск, пр. Машерова, 29 УНП 807000028.
Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка
Республики Беларусь № 3 от 27.10.2006

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ТУРЦЫЯ РАЗГОРТВАЕ СПА КАЛЯ МЕЖАЎ СІРЫІ



Турцыя прыступіла да разгортвання ракетных і артылерыйскіх сістэм СПА ўздоўж мяжы з Сірыяй. Падставай для гэтага стаў інцыдэнт са збітым Сірыяй разведвальным самалётам RF-4E. Прэм'ер-міністр Турцыі Рэджэп Эрдаган патлумачыў, што Сірыя з'яўляецца «відавочнай і непасрэднай пагрозай». Да сірыйскай мяжы быў накіраваны канвой у 30 грузавікоў, дзе знаходзяцца ЗРК. Перад падраздзяленнямі была пастаўлена задача «папярэджання парушэнняў паветранай, сухапутнай і марской межаў». Разведвальны самалёт ВПС Турцыі RF-4E знік з экранаў радараў праз паўтары гадзіны пасля ўзлёту на паўднёвым усходзе ад памежнай з Сірыяй правінцыі Хатай. Пазней яго абломкі знайшлі на дне Міжземнага мора.

### ЛОНДАНЦАЎ АБУРЫЛІ РАКЕТЫ НА ДАХУ

Жыхары шматпавярховага жылога дома ў Лондане, на якім плануецца размясціць ракетную сістэму для забеспячэння бяспекі падчас Алімпійскіх гульняў, паспрабуюць праз суд дамагчыся адмены гэтага рашэння. Гаворка ідзе аб планах размяшчэння ракетнай устаноўкі на будынку Fred Wigg Tower, які знаходзіцца ва ўсходняй частцы горада. Усяго ваенныя плануюць размясціць такія ўстаноўкі ў Лондане ў шасці месцах.

### ПАМЁР НАЙСТАРЭЙШЫ Ў СВЕЦЕ МІЛЬЯРДЭР

101-гадовы бізнэсмен Уолтар Хефнер, самы стары мільярдэр у свеце, памёр у Швейцарыі. Forbes ацэньваў яго капітал у 4,3 мільярда долараў, паставіўшы Хефнера ў штогадовым рэйтынгу самых багатых людзей планеты 2012 года на 248-е месца. Пасля смерці Уолтара Хефнера самым узроставым мільярдэрам у свеце стаў 96-гадовы Дэвід Ракфелер. Стан унука заснавальніка Standard Oil Джона Ракфелера ацэньваецца ў 2,5 мільярда долараў.

### У ЗША НАРКАМАНЫ ЎКРАЛІ ГРУЗАВІК З МЫШАМІ

Двое жыхароў горада Сэнт-Чарльз у амерыканскім штаце Місуры ўкралі грузавік з 2000 мышамі, прызначанымі для медыцынскіх даследаванняў. Зламыснікі пранікліся ў аўтамабіль, разбіўшы шкло, аднак іх дзеянні былі заўважаны. Грузавік быў абсталяваны сістэмай назірання, таму мясцовая паліцыя знайшла яго ўжо праз 20 хвілін і злачынцы былі затрыманы. Паводле слоў саміх згоншчыкаў, яны пакутавалі ад гераінавай залежнасці і пайшлі на злачынства з мэтай здабыць грошай на наркотыкі. Як паведамляецца, кошт мышэй, якія знаходзіліся ў кузаве, склаў 10 тысяч долараў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### КОЛЬКІ ВЫДАТКАВАЛІ БАЛЕЛЬШЧЫКІ НА ЕЎРА-2012



Падчас чэмпіянату Еўропы па футболе 2012 года балельшчыкі выдаткавалі ў Данецку 37 мільёнаў долараў. «За тры тыдні Еўра, па самых першых падліках, у эканоміку горада дадаткова звонку паступіла каля 300 мільёнаў грыўняў — гэта больш за 37 мільёнаў долараў», — сказаў мэр Данецка Аляксандр Лук'янчанка. Паводле яго слоў, на пяці матчах фінальнай часткі Еўра-2012 у Данецку пабывала больш за 300 тысяч балельшчыкаў. Дарэчы, напярэдадні, у дзень правядзення паўфінальнага матча Еўра-2012, Данецк адмовіўся прымаць дэлегацыю прэм'ер-міністра Расіі Дзмітрыя Мядзведзева з меркаванняў бяспекі.

КОРАТКА

Колькасць насельніцтва Беларусі на 1 чэрвеня 2012 года склала 9 млн 458 тыс. чалавек і ў параўнанні з пачаткам гэтага года зменшылася на 7,2 тыс. чалавек, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Інфляцыя ў Беларусі па выніках 2012 года не павінна перавысіць 20 працэнтаў. Аб гэтым заявіў дырэктар Дэпартамента цэнавай палітыкі Міністэрства эканомікі Ігар Фамін. Як паведамлялася, інфляцыя ў Беларусі ў маі 2012 склала 1,6 працэнта.

У эканоміцы Беларусі ў студзені—маі 2012 года былі заняты 4 млн 578,6 тыс. чалавек, што на 2,2 працэнта менш, чым у студзені—маі 2011 года, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

ААТ «БПБ-Ашчадны банк» у 2012 годзе атрымае гарантыю ўрада Беларусі ў пагашэнні асноўнага доўгу па крэдыце на суму $33,5 млн, што выдаецца гэтым банкам ЗАТ «Мяса-малочная кампанія». Такое рашэнне змешчана ў пастанове Савета Міністраў №581 ад 23 чэрвеня 2012 года, паведамілі ў прэс-службе беларускага ўрада. Кампанія выкарыстоўвае крэдыт для правядзення закупачных інтэрвенцый малочнай прадукцыі.

## У МАЗЫРЫ АПАГАНЕНЫ ПРАВАСЛАЎНЫ ХРАМ. ГЭТА ХУЛІГАНСТВА АБО СВЯДОМЫ ВАНДАЛІЗМ?



**Протаіерэй Генадзь НЕСЦЯРЭНЯ, настаяцель прыхода храма прападобнага Сергія Раданежскага ў Мазыры:**

— Праваслаўныя людзі моцныя і мужныя. Таму ўсё, што адбылося, яны перанясуць годна. Цяпер у храме ўсё прыбралі, людзі прыносяць ахвяраванні на аднаўленне таго, што знішчана. Службы і хрышчэнні будуць па-ранейшаму праходзіць у гэтым храме. Блюзнерскія акцыі ні на што не паўплываюць. Я звярнуўся да прыхаджан са словамі: «Давайце будзем маліцца за тых, каго сёння складана нават назваць людзьмі. Яны не ведаюць самі, што робяць, і адкажуць перад Богам за свае ўчынкі. А мы будзем маліцца, каб яны прынеслі пакаянне».



**Мікалай ПРАТАСАВІЦКІ, начальнік аддзела па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Гомельскага аблвыканкама:**

— Як у чалавека, у мяне моцна баліць сэрца, нават калі я проста кажу пра тое злачынства, якое адбылося ў мазырскіх Свята-Міхайлаўскім кафедральным саборы і царкве Сергія Раданежскага. Як адказная асоба, магу сказаць, што адбылося злачынства супраць сумлення і супраць дзяржавы. Сёння гэтым займаецца Следчы камітэт і ўпраўленне КДБ.



**Святлана НАЗДРЫН-ПЛАТНІЦКАЯ, член Саюза мастакоў і Саюза дызайнераў Рэспублікі Беларусь:**

— Нянавісць сатанінская да хрысціян — гэта нават не справа рук тых, хто гэта рабіў, а іх натхняльніка. Акрамя таго, відаць, дзесьці ёсць чалавек, які згуртаваў вакол сябе гэтых злачынцаў. Шкада іх, але Бог зганьбаваны не бывае і ім гэта абавязкова адгукнецца. Не цяпер, дык потым. Гэтыя людзі сацыяльна небяспечныя, і іх абавязкова трэба выявіць. Уявіце, якія яны потым могуць стварыць сем'і? Тым больш, за такое злачынства духоўнае пакаранне могуць панесці і іх сваякі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

2012 ГОД КНІГІ

# ЯК МЫ ВЕДАЕМ РОДНУЮ ЛІТАРАТУРУ?

**Высветліць гэта дазволіць адмысловы конкурс-віктарына, арганізаваны прадпрыемствам «Белпошта».**

Паводле ўмоў, удзельнічаць у ім могуць усе ахвотныя, не маладзейшыя за 14 гадоў. І трэба для гэтага зусім няшмат: уважліва прачытаўшы, даць адказ на кожнае з 10 пытанняў.

— За тры месяцы (конкурс стартаваў у красавіку) на адрас прадпрыемства прыйшло некалькі тысяч лістоў, — падводзячы вынікі першага этапу, паведаміла «Звяздзе» старшыня камісіі, **намеснік генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях Таццяна Мікалаеўна ГВОЗДЗЕВА.** — Самай першай правільныя адказы даслала Ірына Пятроўна Пуцыковіч з г. Іванава. Другі галоўны прыз дастаўся мінчаніну Дзмітрыю Пятровічу Аўчыннікаву.

Шляхам розыгрышу былі вызначаны і дзесяць прызёраў. Сярод іх Наталля Пятровіч з вёскі Аюцавічы Карэліцкага раёна (мяркуючы па анкеце са «Звязды», падпісчыца нашай газеты), Дзіяна Пятрэнка з вёскі В. Малешава Столінскага раёна, Таццяна Марозава з Полацка, Кацярына Ларкова з Дзяржынска і іншыя.

Пераможцам будуць уручаны граматы і сувенірныя выданні — кнігі паштовых марак Рэспублікі Беларусь, прызёрам — тэматычныя наборы марак.

Улічваючы вялікую цікавасць да творчасці беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, конкурс-віктарына будзе праходзіць у некалькі этапаў. Для тых, хто хоча далучыцца і праверыць свае веды, друкуем пытанні. Адказы (гэта значыць, запоўненую анкету, а разам — свае прозвішча, імя, імя па бацьку, год нараджэння, адрас, кантактны тэлефон) можна накіраваць *заказным лістом* на адрас: РУП «Белпошта», а.с. №387, 220050, Мінск (з пазнакай «На конкурс»). Другі этап яго — з вызначэннем новых пераможцаў і прызёраў — фінішуе 31 ліпеня.

БЕЛПОЧТА

**У рамках мерапрыемстваў, прысвечаных Году кнігі, «РУП» Белпошта запрашае прыняць удзел у конкурсе-віктарыне**

**«ЯК ТЫ ВЕДАЕШ РОДНУЮ ЛІТАРАТУРУ?»**

**Пераможцаў чакаюць прызы!**

**1)** Каму належыць наступнае выказванне аб роднай мове?

«...і з усяго таго, што лягло назаўсёды ў аснову святыні народа, бяссмерця яго, – Ты выткана, дзіўная родная мова».

**2)** Які аўтар друкаваўся пад псеўданімам «Сымон Рэўка з-пад Барысава»?

**3)** Назавіце твор, аўтара і дзеючую асобу, якой належыць наступнае выказванне:

«...Ганьба таму чалавеку, што рукі апусціць, як перавяслы, і чакае, пакуль сама доля к яму прыйдзе ў хату і папросіцца, каб прыняў яе з ласкі свае!..»

Твор | Аўтар
Дзеючая асоба

**4)** Хто з прапанаваных паэтаў з'яўляецца аўтарам верша «Пахне чабор»?

☐ Якуб Колас ☐ Максім Танк
☐ Пятрусь Броўка ☐ Кандрат Крапіва

**5)** Назавіце твор, аўтара і дзеючую асобу, якой належыць наступнае меркаванне:

«Што ні кажы, а жыццё, ужо само па сабе, ёсць радасць, вялікае шчасце, бясцэнны дар. Ёсць важныя дзве часціны, з якіх складаецца жыццё і яго глыбокі сэнс і хараство — чалавек і прырода...»

Твор | Аўтар
Дзеючая асоба

**6)** «Груша цвіла апошні год», – такімі радкамі пачынаецца:

☐ аповесць Максіма Гарэцкага «Ціхая плынь»
☐ раман Івана Мележа «Людзі на балоце»
☐ аповесць Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха»
☐ раман Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім»

**7)** Якому беларускаму пісьменніку належыць наступнае выказванне?

«...Народная творчасць наогул, а беларуская народная творчасць увасобку – гэта мора, якое хавае ў сабе незлічоныя скарбы. Толькі трэба ўмець гэтыя скарбы дастаць».

**8)** Каму належаць наступныя радкі?

«Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так як той чалавек перад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!..»

**9)** Хто з'яўляецца аўтарам наступных радкоў?

«Хто мы такія? Толькі падарожныя, – папутнікі сярод нябёс. Нашто ж на зямлі сваркі і звадкі, боль і горыч, калі ўсе мы разам ляцім да зор?».

**10)** З якога верша наступныя радкі і хто яго аўтар?

Пачынаецца ўсё з любві.
А інакш і жыць немагчыма.

Твор | Аўтар

■ Пасля пісьма

## ГЭТА БЫЛА НЕ САЖАЛКА...

«...Мы з дзедам каровы не маем, сіл не хапае трымаць. Таму амаль кожны вечар я хаджу па малако да суседзяў. Вось і ў той раз выйшла з дому, прабіраюся па сцежцы ля платоў, бачу: ля суседняга двара стаяць незнаёмыя — двое мужчын і адна жанчына. Чую — размаўляюць, але не па-нашаму. Падыходжу бліжэй. Адзін на ломаннай рускай мове пытаецца:

— А чаму ў вас пасярод вуліцы сажалка?.. І ці ёсць тут рыба?

— Гэта не сажалка, — адказваю, — проста калдобіна, дажджом вады наліло...

— Дык што — тут машыны ездзяць? — здзіўляюцца госці.

— А як жа, ездзяць...»

Вось такі, можна сказаць, малюнак з натуры даслала ў рэдакцыю спадарыня Дубадзелава з вёскі Леніна Добрушскага раёна — даслала летась: ліст быў змешчаны на старонках «Звязды» 3 лютага.

У адказ на гэтую публікацыю кіраўніцтва Добрушскага райвыканкама паведаміла, што правядзенне капітальнага рамонту дарожнага пакрыцця вуліцы прадугледжвалася ў рамках вырашэння праграмы «Адраджэнне і развіццё вёскі на 2005 — 2010 гады», аднак работы не былі праведзены з-за адсутнасці сродкаў... Сродкі — на вытворчасць праектна-пошукавых і пачатак будаўнічых работ у памеры 480 мільёнаў рублёў — выдаткаваны з абласнога бюджэту ў 2011-м годзе.

Сёлета, у 2012-м (паводле новага ліста з Добрушскага райвыканкама), усе работы ў адпаведнасці з праектна-каштарыснай дакументацыяй завершаны: на вуліцы Жодзінскай і ў завулку Камсамольскім аграгарадка Леніна з'явілася новае асфальтавае пакрыццё. А гэта азначае, што просьбы людзей пачуты: «сажалкі» больш няма. ■

**ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**
**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в деревне Вызволенье и деревне Пекалин Пекалинского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | **30 июля 2012 года, в 15.00,** д. Пекалин, ул. Ленина, 34, Пекалинский сельисполком, зал заседаний |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Пекалинский сельисполком, д. Пекалин, ул. Ленина, 34 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 — площадь 0,15 га № 624883601601000071 д. Вызволенье; Лот № 2 — площадь 0,2033 га № 624883603601000235 д. Пекалин |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот № 1 — 17 138 700 рублей<br>Лот № 2 — 61 365 720 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | д. Вызволенье — электроснабжение; д. Пекалин, ул. Приозерная — электроснабжение, водоснабжение, водоотведение, газоснабжение |
| 10 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 5-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка, р/с 3600627070008 ЦБУ 621 г. Смолевичи филиал № 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04901 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 12 | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками** | Каждая среда в 12.00 |
| 13 | **Окончательный срок приема документов** | 17 июля 2012 года в 17.00 |
| 14 | **Контактный телефон** | 8 01776 61 624, 61 634, Vel 314 43 01 |

Расходы по организации и проведению аукциона (лот № 1 — 1779341, № 2 — 1691389), затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств в РБ серии ВС № 7155890, с № 7194057 по № 7194063 в количестве 7 штук, с № 7194073 по № 7194077 в количестве 5 штук, 9025509, 9025655, 9041271, с № 9041294 по № 9041300 в количестве 7 штук; по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств в РБ (комплексное страхование) серии КС № 0688356, 0688357; квитанции формы 1-СУ серии КС № 3592681, 3592684, 3592691, 3592692, 3592697, 3592698, с № 3609993 по № 3609995 в количестве 3 штук, с № 3609998 по № 3610000 в количестве 3 штук; по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РП, 2РН серии БА с № 0103814 по № 0103855 в количестве 42 штук; по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств выезжающих в страны системы «Зеленая карта» BY № 6922586, с № 6892155 по № 6892159 в количестве 5 штук, с № 6922590 по № 6922595 в количестве 6 штук; по добровольному страхованию от несчастных случаев формы 2РН (пассажиры) серии ПТ № 0126248; по добровольному страхованию формы 2РН, 2РП (универсальный) серии ПЕ № 0020807, 0020809, 0020810 **считать недействительными.**

**ИНФОРМАЦИЯ**
**о проведении открытого аукциона без условий по продаже имущества предприятия, находящегося в процедуре банкротства с ликвидацией**

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | Расположен по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, д. Красное, ул. Советская, 1/21.<br>1. Здание склада № 1 с инвентарным номером 630/С-42565. Начальная цена **49 857 600 (Сорок девять миллионов восемьсот пятьдесят семь тысяч шестьсот) рублей (с учетом НДС).**<br>Решение об отводе земельного участка имеется.<br>Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. |
| **Продавец** | СОАО «Красненский консервный завод» |
| **Организатор аукциона** | Управляющий СОАО «Красненский консервный завод». |
| **Сумма задатка** | 4 985 760 рублей на р/с 3012203180011 в отд. АСБ «Беларусбанк» ф-л № 601 г. Молодечно, МФО 153001769 УНН 600077935, ОКПО 00390892. Получатель: СОАО «Красненский консервный завод». |
| **Порядок оплаты** | Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) производится на р/с СОАО «Красненский консервный завод» в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней, после проведения аукциона. |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам — копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, заверенные нотариально, доверенность, выданная представителю юридического лица; физическим лицам — паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, справку ИМНС об отсутствии задолженности по подоходному налогу. |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | **26.07.2012 г. до 16.00,** Минская обл., Молодечненский р-н, д. Красное, ул. Советская, 1, управляющий СОАО «Красненский консервный завод», тел.: (8 01771), 5 36 77 (факс), МТС 8 029 578 36 77; velkom 8 029 685 36 77. |
| **Дата, время и место аукциона** | **27.07.2012 г. в 11.00,** Минская обл., Молодечненский р-н, д. Красное, ул. Советская, 1.<br>**Аукцион состоится при наличии не мене двух участников на один лот.** |

## «Абчысцілі» вагоны

**Ноччу з двух вагонаў дызель-цягніка на тэрыторыі базы захоўвання Аршанскага лакаматыўнага дэпо нехта выкраў электрапровад, кошт якога ў дэпо ацанілі на суму звыш 1,4 мільёна рублёў.**

Высветлілася, што такім чынам «чысцілі» вагоны два беспрацоўныя жыхары Барысава, адзін з якіх раней судзімы за крадзеж і ўхіленне ад выплаты штрафу. Заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Утеряно: 10.05.2012 г. в Барановичском районе на участке автодороги Брест–Москва утеряна печать, содержащая следующие реквизиты: **ИП Анисимов Андрей Юрьевич, УНП 290759830.** Убедительная просьба нашедшего сообщить по тел. 8 (029) 521 20 03, **вознаграждение гарантировано.**

**Объявляем запрос ценовых предложений**
**ПО ЗАКУПКЕ ОДНОРЯДНОГО МОРКОВО-УБОРОЧНОГО КОМБАЙНА ТЕРЕБИЛЬНОГО ТИПА.**
Срок подачи – 10 дней. Контактный телефон — **8017 14 47 317.** УНН 600004285

## НОВЫ ДЫРЭКТАР КРЭПАСЦІ

**У знакавы для Брэсцкай крэпасці дзень, 22 чэрвеня, на пасаду дырэктара мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» быў прызначаны Рыгор Бысюк. Да гэтага Рыгор Рыгоравіч 17 гадоў узначальваў абласное ўпраўленне культуры.**

Крэпасць — асаблівы аб'ект. Яе наведваюць сотні тысяч турыстаў з усяго свету. Тут былі прэзідэнты, кіраўнікі ўрадаў, вядомыя палітыкі многіх дзяржаў. Усе тры прэзідэнты Расіі ў розны час ускладалі кветкі да Вечнага агню мемарыяла.

За апошнія паўтара дзясятка гадоў у крэпасці праведзена вялікая работа па рамонце, рэканструкцыі, добраўпарадкаванні. Гэту справу належыць працягваць.

Як стала вядома, новы дырэктар прыйшоў у калектыў з планамі далейшага развіцця турыстычнай інфраструктуры, новымі выставачнымі і іншымі праектамі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА**
**Продавец — Раковский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области**

| Лот | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок в агрогородке Раков, улица Набережная, 25 площадью 0,1500 гектара | Кадастровый номер участка 622085715642000019. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеется природный газ, подъезд, электричество | 42 000 000 | 4 200 000 |
| 2 | Земельный участок в деревне Михалово, участок № А2 площадью 0,1950 гектара | Кадастровый номер участка 622085711601000190. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Новый район застройки. | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 3 | Земельный участок в деревне Шаповалы, участок № 21а площадью 0,1500 гектара | Кадастровый номер участка 622085719601000039. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеются подъездные пути, электричество. Расстояние от Ракова 20 километров, от г. Заславль — 8 км | 22 000 000 | 2 200 000 |

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется квитанцией на расчетный счет госказначейства № 3600614140501 Главное управление МФ РБ по Минской области в ЦБУ № 605, г. Воложин, филиал № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600537220. Код платежа 04901.

Аукцион состоится **10 августа 2012 года (пятница) в 10.00** по адресу: агрогородок Раков, площадь Свободы, 11, 2-ой этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до 06 августа (включительно) до 17.00 по адресу: аг. Раков, пл. Свободы, 11, кабинет управляющего делами исполкома.

**УПРАВЛЯЮЩИЙ В ПРОИЗВОДСТВЕ ПО ДЕЛУ О БАНКРОТСТВЕ ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ**
**31 июля 2012 года торгов по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Трикотажная фабрика «Славянка» (ОАО «ТФ «Славянка»), расположенного по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, ул. Крупской, 12**

| Объект продажи | Характеристика объекта | Начальная цена продажи без НДС, бел. рублей | Задаток, бел. рублей |
|---|---|---|---|
| ЛОТ | | | |
| Административное помещение, производственное здание, транспортная проходная, гараж, беседка, мехмастерская, склад, эстакада, склад ТМЦ, гараж, склад ГСМ, сварочное отделение, учебный корпус, забор кирпичный, забор железобетонный, покрытие асфальтовое, покрытие бетонное, пожарный водоем, автотранспорт, швейное, металлообрабатывающее и иное оборудование | **Административное помещение –** трехэтажное изолированное помещение в четырехэтажном здании, общая площадь 1522,5 кв.м, стены кирпичные, панели, год постройки 1969, кровля рулонная совмещенная с перекрытием.<br>**Производственное здание –** трехэтажное здание, общая площадь 5213,3 кв.м, стены кирпичные, панели, год постройки 1969, кровля рулонная совмещенная с покрытием.<br>**Транспортная проходная –** одноэтажное строение, общая площадь 20,1 кв.м, стены каркасно-засыпные, год постройки 1992, крыша шиферная.<br>**Гараж –** одноэтажное строение, общая площадь 51,4 кв.м, стены кирпичные, год постройки 1969, крыша рулонная.<br>**Беседка** – деревянная, 9 кв.м.<br>**Мехмастерская –** одноэтажное строение, общая площадь 329,6 кв.м, стены кирпичные, год постройки 1955.<br>**Склад –** одноэтажное строение, общая площадь 85,6 кв.м, стены кирпичные, год постройки 1969, крыша рулонная.<br>**Эстакада –** металлическая, ширина – 2,5 м, длина – 8,6 м.<br>**Склад ТМЦ –** одноэтажное строение, общая площадь 361,5 кв.м, стены кирпичные, год постройки 1954, крыша шиферная двухскатная.<br>**Гараж –** одноэтажное строение, общая площадь 157,8 кв.м, стены кирпичные, год постройки 1974, кровля рулонная совмещенная с покрытием;<br>**Склад ГСМ –** одноэтажное строение, общая площадь 16,5 кв.м, стены кирпичные, год постройки 1975, кровля рулонная совмещенная с покрытием.<br>**Сварочное отделение –** одноэтажное строение, общая площадь 25,6 кв.м, стены кирпичные, год постройки 1969, кровля рулонная.<br>**Пожарный водоем –** объем 200 куб.м, год постройки 1969, монолитный, железобетонный.<br>**Учебный корпус –** одноэтажное строение, общая площадь 198,64 кв.м, стены кирпичные, год постройки 1960, крыша шиферная двухскатная.<br>**Забор кирпичный –** 240,4 кв.м.<br>**Покрытие асфальтовое –** 722,0 кв.м.<br>**Покрытие бетонное –** 1048,0 кв.м.<br>**Забор железобетонный –** 132,0 кв.м. | **12 027 945 070** | **1 202 794 507** |

С перечнем и состоянием имущества можно ознакомиться по месту его нахождения и на интернет-сайтах: **www.mozyrisp.gov.by**, **www.economy.gov.by**.

Торги проводятся в форме открытого аукциона без условий.

**Аукцион состоится 31 июля 2012 года по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, ул. Крупской, 12. Начало в 12.00.**

Порядок подачи документов определен условиями проведения аукциона.

Для участия в аукционе участник перечисляет платежными поручениями **задаток в размере 10%** от начальной цены продажи выставленного на торги лота **на р/с 3012670001014 в ЦКО № 6 Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, код 739. Получатель платежа – ОАО «Трикотажная фабрика «Славянка». УНП 400087179.**

**Документы на участие в аукционе принимаются с даты опубликования информационного извещения по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, ул. Крупской, 12 с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по рабочим дням по 27 июля 2012 года включительно.**

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также предоставившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и документ, подтверждающий его полномочия.

Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену покупки. Цена не включает НДС.

В случае признания торгов несостоявшимися по причине поступления только одной заявки, имущество продается по прямому договору купли-продажи с лицом, подавшим заявку, по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Победитель торгов обязан после подписания протокола о проведении аукциона в течение 10 рабочих дней подписать договор купли-продажи.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

**Контактные телефоны организатора аукциона: (0236) 32 41 48; (0236) 32 42 83; (029) 657 27 13; (029) 531 96 14.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА В БОБРУЙСКОМ РАЙОНЕ**

| Номер лота по порядку | Местоположение земельного участка | Начальная цена (руб.) | Размер задатка (руб.) | Расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения | Условие проведения аукциона | Характеристика земельного участка | Кадастровый номер | Инженерная и транспортная инфраструктура |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Бобруйский район, д. Щатково, пер. 4-й Юбилейный, 1 | 7 583 680 | 758 368 | 4 683 896 (расходы возмещает победитель аукциона) | Наличие не менее двух участников | Площадь 0,1823 га | № 720884012601000174 | Имеется подключение к электроснабжению |

**ПРИМЕЧАНИЕ:** Аукцион состоится **30.07.2012** года в 15.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, 2-й этаж, малый зал заседаний. Заявления принимаются по адресу: г. Бобруйск, ул. М. Горького, д. 41, каб. 2, в рабочие дни с 08.00 до 17.00 с 1-ого дня после публикации извещения в СМИ. Последний день приема заявлений – **24.07.2012** года до 17.00. Информация о земельных участках по контактному телефону в г. Бобруйске: 52 70 24.

Для участия в аукционе гражданин Республики Беларусь (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы в комиссию по проведению аукционов:

- заявление на участие в аукционе (с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка);
- заверенную копию платежного поручения о внесении задатка (10% от начальной цены) на расчетный счет Сычковского сельисполкома № 3604712110312 в АСБ «Беларусбанк» филиал 703, код 760, УНН 700045734, код платежа 04901;
- представителем гражданина Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;
- при подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Порядок проведения аукциона:

1. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет задаток.
2. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным предмет аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем в отношении соответствующего предмета аукциона.
3. При отсутствии лиц из участников аукциона, готовых выкупить предмет аукциона по названной цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера.
4. Предмет аукциона снимается с аукциона по решению комиссии или организации до начала проведения аукциона в случае отсутствия участников аукциона либо если на объект аукциона претендует только один гражданин.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ СЫЧКОВСКОГО СЕЛЬСКОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА З.С. Трубочка

Трастбанк

**Уважаемые вкладчики ЗАО «Трастбанк»!**

Информируем вас о том, что:

- **с 4 августа 2012 г.** будут действовать новые условия по следующим вкладам в иностранной валюте, оформленным в период с 14.01.2012 по 03.02.2012 (включительно):

| Вид вклада (депозита) | Ранее действующий размер процентных ставок | Новый размер процентных ставок (с 04.08.2012) |
|---|---|---|
| «VIP» | 10% | 7% |

- **с 18 августа 2012 г.** будут действовать новые условия по следующим вкладам в иностранной валюте, оформленным в период с 14.01.2012 по 17.02.2012 (включительно):

| Вид вклада (депозита) | Ранее действующий размер процентных ставок | Новый размер процентных ставок (с 18.08.2012) |
|---|---|---|
| «Шкварка | 9,5% | 7% |

По возникшим вопросам Вы можете обратиться в контакт-центр Банка (**465** – с мобильного, **8 801 1 003 333** – бесплатный номер для звонков с городского телефона).

УНП 100789114. Лиц. № 14 от 13.11.2008 г. НБ РБ.

Хто адкажа, як завецца
Тое, што пад ветрам гнецца
І шапоча успаміны
Пра мінулыя часіны?
Хто адкажа, як завецца
Тое, што да неба мкнецца
І пад сонейкам дужэе,
Залаціцца, прыгажэе?
Той, хто скажа, — знаўца тонкі,
Ён жытнёваю саломкай
Упрыгожыць кут і сенцы,
Зробіць зоркі на акенцы,
Капялюш сплясце, што трэба,
І паўмісачку для хлеба...
А ўмельца больш вядомы
Нават коніка з саломы
Так змайструе — заглядзецца!
Паляціць ён полем, лесам,
Небакраем, паднябессем
Ад Прыдзвіння да Палесся.






**Гэты здымак я зрабіў на віцебскім беразе Заходняй Дзвіны. «Зацугляць» для фотаздымкаў вялікага і маленькага саламяных конікаў мне дапамагла Людміла Вараб'ёва, кіраўнік гуртка саломапляцення культурна-гістарычнага комплексу «Залатое кола Віцебска «Дзвіна».**

# НЕ ПРОСТА СПАБОРНІЦТВЫ — СВЯТА

**УЖО па добрай традыцыі ў Гродне прайшлі спаборніцтвы «Алімпійскія дні моладзі Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы» на прызы газеты «Звязда». Больш за 150 хлопцаў і дзяўчат 1995-1996 гадоў нараджэння з усіх абласцей нашай краіны і сталіцы на працягу двух дзён выяўлялі мацнейшых у сарака відах «каралевы спорту».**



Марыя Бачко і Юрый Ярэміч.

— Для дзяцей гэта не проста спаборніцтвы, а свята. Каб не толькі паказаць сябе і ўбачыць іншых, так бы мовіць, ва ўсёй красе, парадаваць спартыўнымі вынікамі, але ўзбагаціцца новымі ўражаннямі, знаёмствамі, — зазначае адна з «зорак» спартыўнай хадзьбы, трохразовы прызёр чэмпіянатаў свету, старшы трэнер нацыянальнай лёгкаатлетычнай каманды Беларусі па рэзервах **Валянціна ЦЫБУЛЬСКАЯ.** — Дзякуй гродзенцам за выдатную арганізацыю гэтых спаборніцтваў, а газеце «Звязда» — за прадастаўленыя прызы.

Паводле ацэнкі Валянціны Іванаўны, гэтыя спаборніцтвы пацвердзілі, што сярод відаў лёгкай атлетыкі нашым традыцыйным «каньком» з'яўляецца кіданне, на някепскі ўзровень таксама выходзяць скачкі, спартыўная хадзьба. Ды і ў іншых дысцыплінах ёсць таленавітыя спартсмены, у якіх пры належнай працы іх асабіста і, безумоўна, трэнераў ёсць добрыя перспектывы спартыўнага росту. Што тычыцца рэгіёнаў, то найлепш з лёгкаатлетычным рэзервам працуюць на Гродзеншчыне і Брэстчыне.




Ян Слома і Вікторыя Рашчупкіна.

Дарэчы, менавіта прадстаўнікі гэтых абласцей і сталі сёлетнімі лаўрэатамі прызоў «Звязды». Гродзенец Ян Слома, які ў гэтым годзе першынстваваў на матчавай сустрэчы ў Трабзоне (Турцыя), у горадзе над Нёманам перамог у абедзвюх дысцыплінах (бег на 400 і 800 метраў), а таксама ў эстафеце. А сярод дзяўчат лепшай спартсменкай прызналі Вікторыю Рашчупкіну з Брэста, якая перамагла ў спартыўнай хадзьбе на пяць кіламетраў. Дарэчы, яна даволі паспяхова выступіла на спаборніцтвах Кубка свету, прычым у кампаніі не сваіх аднагодак, а старэйшых па ўзросце юніёраў. Таксама адзначаны прызамі пераможцы ў адным з найбольш складаных відаў лёгкай атлетыкі — мнагаборцы Марыя Бачко з Ліды і Юрый Ярэміч з г. Масты.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.**

# СЦЕРАЖЫСЯ «ЧЫРВОНАЙ ФУРЫІ»



**Зборная Іспаніі стала першым фіналістам сёлетняга першынства Еўропы па футболе.**

Яшчэ напярэдадні Еўра-2012 спецыялісты і балельшчыкі актыўна адпраўлялі падапечных Вісэнтэ дэль Боске ў шэраг фаварытаў. І як паказваюць апошнія падзеі, футбалісты былі не супраць. Іспанская зборная на адным дыханні праводзіць чэмпіянат, нягледзячы на тое, што ў паўфінале добра паказытала нервы прыхільнікам.



За шчаслівы білецік у фінал Ікер Касільес і кампанія спрачаліся з суседзямі — камандай Партугаліі. Гламурна-тэхнічны Крышціяну Раналду, брутальны чалавек-тату Рауль Мейрэлеш, дзёрзкі Пепе — на гэтым турніры пірэнейцы заслужылі званне не толькі самай эпатажнай каманды, але і тэхнічнай, якая ператварае матч у маленькі футбольны спектакль.

Не, гульня «геаграфічных» сяброў не стала трыумфам галоў і небяспечных момантаў. Гэта, хутчэй, драма ў Данецку, у якой усё вырашала псіхалогія, упэўненасць, фартуна. Асноўная частка бітвы за Пірэнеі скончылася мірам (0:0), дадатковая — таксама. Вызначаць лепшага прыйшлося ў серыі пасляматчавых пенальці. І тут больш удалымі аказаліся іспанцы, чэмпіёны мінулага кантынентальнага чэмпіянату (4:2). Ці ўтрымаюць яны званне чэмпіёнаў Еўропы, даведаемся ў нядзелю. Раней два чэмпіянаты запар не ўдавалася выйграць нікому.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

■ Экслібрыс «Звязды»

# УЦЁКІ Ў ДЗЯЦІНСТВА

## «Закаханы ў Снягурку». Укладальнік А.С. Масла. Апавяданні, казкі, мініяцюры. «Мастацкая літаратура», 2012.




Неаспрэчны яшчэ дзесяць гадоў таму тэзіс пра нераспрацаванасць сучаснай дзіцячай літаратуры сёння пацiху страчвае сваю актуальнасць. Дзіцячая літаратура цяпер на шляху да росквіту, пра што сведчыць і заснаванне выдавецтвам «Мастацкая літаратура» серыі «Маладзік». Вядома, гэта асабістая ініцыятыва пісьменніцы-казачніцы Алены Масла, але гэтая прапанова, відавочна, стала водгукам на аб'ектыўныя патрэбы беларускай культурнай прасторы.

Калі пісьменнік перастаў быць заканадаўцам мод, калі ён перастаў быць аўтарытэтам, калі літаратура перастала вучыць жыццю, бо аўтары самі апынуліся ў разгубленасці, «дарослая» літаратура сутыкнулася з крызісам самарэфлексіі.

Пісьменнікі ўсімі намаганнямі пазбягалі неабходнасці асэнсоўваць актуальнае жыццё сваіх сучаснікаў (натуральна, былі выключэнні, якія толькі падсвечвалі новую тэндэнцыю). Літаратура паступова дрэйфавала ў сферу забаў: калі я не магу навучыць вас — я магу вас забаўляць, нібыта казалі пісьменнікі.

У часы, калі ў творчым асяродку пануе разгубленасць ці то ад грамадска-сацыяльных змен, ці то ад страты былога статусу, ці то ад усвядомленай катастрафічнасці быцця (як гэта было пасля вайны), ёсць кампраміс — магчымасць перайсці ў іншую вагавую катэгорыю — у пераклады, дзіцячую літаратуру. Зрэшты, ці мала тэм, дзе можна схавацца ад жыцця?

У зборнік «Закаханы ў Снягурку» Алена Масла сабрала аўтараў і тэксты, якія ствараюць досыць рэпрэзентатыўную карціну беларускай літаратуры, не толькі дзіцячай. У кнізе прадстаўлены 23 пісьменнікі некалькіх пакаленняў, якія прапаноўваюць — і гэта важна — розныя жыццёвыя стратэгіі.

Падлеткам жыццё здаецца шалёна цяжкім: любы канфлікт эскалуецца да апакаліпсісу, любая дробная крыўда траўмуе нібыта назаўсёды. Герой-падлетак пакутуе ад комплексу Гары Потэра: я слабы, я не ўмею вырашаць праблемы, з якімі сутыкае мяне жыццё, але ў мяне ёсць чароўная палачка (творы Г. Аўласенкі, Р. Баравіковай, С. Мінскевіча). У тэкстах абмінаецца ўсё тое, што датычыць пабудовы кар'еры, рэцэптаў сацыяльнага поспеху тут і цяпер: і героі, альбо гнаныя комплексам Папялушкі, атрымліваюць усё гатовае (В. Кустава), альбо адчайна прагнуць звычайнага шчасця, якое заключаецца не ў матэрыяльных дабротах, а ва ўменні боўтаць нагамі і здзьмуваць за адзін раз белую шапачку з дзьмухаўца (А. Мальчэўская), альбо ўлюбляюцца ў Снягурку, якая ніколі не адкажа ўзаемнасцю: гарантаванае няшчаснае каханне (В. Шніп).

Можна пайсці іншым шляхам — і прызнаць неадольную наяўнасць рэчаіснасці: ёсць законы, маральныя ці юрыдычныя, па якіх мы мусім жыць. І гэта не значыць змірыцца і зламацца, наадварот, гэта значыць не губляць свае сілы марна, на тое, што немагчыма змяніць, творы аптымістычныя, жыццесцвярджальныя незалежна ад фіналу (В. Гапееў, С. Верацiла, Л. Дрожжа, Ю. Нераток, Г. Пшонік, Л. Рублеўская, П. Сіняўскі, Ф. Сіўко, А. Бязлепкіна, А. Бензярук).

Цікава, што ўсе маладыя аўтары зборніка пазбеглі сваёй сучаснасці і перанеслі ўсю актуальнасць твораў у ідэйны пласт. Гэта ў нечым вымушаны крок, бо ва ўмовах «халоднай вайны» тэхналогій так лёгка стаць несучасным: адышлі ў нябыт магнітафонныя касеты, танец шэйк, штапельныя спадніцы і курс долара ў 2000 беларускіх рублёў.

Некаторыя тэксты могуць мець выразны псіхатэрапеўтычны эфект, вучаць выжываць у жорсткім свеце падлеткаў (В. Гапееў), іншыя напісаны так, каб і дарослыя знайшлі там цікавае ці прачыталі твор інакш, не так, як моладзь (А. Федарэнка, М. Аляшкевіч, А. Масла, А. Наварыч). Свет людзей у творах дапаўняецца светам звяроў і фантастычных істот (Л. Сільнова), вось толькі негуманныя ўчынкі homo sapiens часта прыводзяць да смяротных наступстваў (Р. Бензярук, А. Масла, А. Кавалеўскі).

У кнізе шмат фантастыкі, першага няўмелага кахання, жорсткасці і дабрыні. Шмат самога жыцця. А чаргаванне фантастычна-эскейпічнага і побытава-будзённага (дзякуй укладальніцы) стварае галоўнае пасланне кнігі: жыць не страшна.

Кніга прадстаўлена Домам кнігі «Светач» (г. Мінск, пр. Пераможцаў, 11).

**Аксана БЯЗЛЕПКІНА**

Віншую з 50-гадовым юбілеем хросную дачку **Ларысу**! Жадаю моцнага здароўя, шчасця.
**Твая хросная маці Галіна Латышонак.**

У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ

**Напярэдадні святкавання Дня Незалежнасці аэрадром Міністэрства надзвычайных сітуацый «Ліпкі», што пад Мінскам, нагадвае... эпізод з ваеннага кінафільма. Толькі ні ў якой кінастужцы такую вялікую колькасць ваеннай тэхнікі ў адным месцы не ўбачыш. А на святочным парадзе 3 ліпеня ці на яго рэпетыцыі, дзе і давялося папрысутнічаць карэспандэнтам «Звязды», — калі ласка!**



Даты | Падзеі | Людзі

**1775** год — адкрылася Гродзенская медыцынская акадэмія — першая ў Беларусі вышэйшая навучальная ўстанова па падрыхтоўцы медыцынскага персаналу (арганізатар і кіраўнік Жан Жылібер). Дзейнічала ў Гродне да 1781 года, затым была пераведзена ў Вільню ў якасці медыцынскага факультэта Віленскага ўніверсітэта.

**1561** год — у Маскве было завершана будаўніцтва храма Пакрова Божай Маці (сабора Васіля Блажэннага). Ён быў узведзены ў гонар узяцця ў 1552 годзе Казані, сталіцы Казанскага ханства. Да канца XVII стагоддзя сабор быў самым высокім будынкам Масквы: яго вышыня — 60 метраў. Вобраз гэтага сабора не раз ставіў у тупік іншаземцаў. Аднаму нямецкаму падарожніку здавалася, што храм створаны «больш для ўпрыгожвання, чым для малітвы». Як толькі яго не называлі: і гіганцкім кандытарскім вырабам, і «злепкам сталагмітаў», і «будынкам з аблокаў, мудрагеліста афарбаваных сонцам». Храм Васіля Блажэннага не раз цярпеў ад агню і рабаванняў. Пачалося ўсё яшчэ падчас польска-шведскай інтэрвенцыі 1612 года, а падчас знаходжання французаў у Маскве ў 1812-м напалеонаўскія салдаты зрабілі ў ім стайню. Адступаючы, Напалеон аддаў загад падарваць «мячэць» (так ён чамусьці назваў сабор), але гэты загад не паспелі выканаць. Другі раз Бог выратаваў сабор у 1930-я гады, ужо пры савецкай уладзе — тады ён таксама ацалеў толькі цудам. Яшчэ ў 1929 годзе храм быў зачынены, тады ж былі зняты званы — іх сталі зноў збіраць толькі ў 1990 годзе. Цяпер сабор Васіля Блажэннага — філіял Дзяржаўнага гістарычнага музея Расіі.

**1906** год — нарадзіўся Іван Данілавіч Чарняхоўскі, вядомы савецкі военачальнік, двойчы Герой Савецкага Саюза (1943, 1944), генерал арміі (1944). У гады Вялікай Айчыннай вайны камандаваў танкавай дывізіяй, танкавым корпусам, арміяй; камандуючы войскамі Заходняга, а затым 3-га Беларускага франтоў (1944—45). Войскі 3-га Беларускага фронту пад яго камандаваннем разам з 1-м Прыбалтыйскім фронтам ажыццявілі Віцебска-Аршанскую аперацыю (1944), а з 1-м і 2-м Беларускімі франтамі — Мінскую аперацыю (1944), стварылі мінскі «кацёл», вызвалілі Віцебск, Оршу , Барысаў, Мінск, Вільнюс і іншыя населеныя пункты. 18 лютага 1945 года быў цяжка паранены асколкамі артылерыйскага снарада на ўскраіне горада Мельзак ва Усходняй Прусіі (цяпер Польшча) і ў той жа дзень памёр. Быў пахаваны ў Вільні на адной з цэнтральных плошчаў. У пачатку 90-х гадоў, пасля распаду СССР, прах І.Д. Чарняхоўскага быў перапахаваны ў Маскве на Новадзявочых могілках.



Было сказана

**Пятрусь Броўка (1905—1980), народны паэт Беларусі:**
***«Усё пакінуць след павінна».***

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Батаніка. Ранальда. Скіт. Юта. Бот. Амга. Проза. Аправа. Норка. Акр. Раман. Ірвін. Тон. Ток. Карп. Атара. Адамар. Таварыш. Ара. Ажына. Дака. Марал. Ракаў. Капа. Тарэра. Стол. Камізэлька.

**Па вертыкалі:** Аршавін. Адам. Грыва. Тара. Амар. Авантура. Абутак. Мак. Арал. Куст. Руні. Курск. Кабан. Жыла. Эта. Парам. Рататар. Тата. Алі. Парсек. Асада. Омметр. Рак. Оптыка. Заказнік. Шаўчэнка.

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.41 | 21.45 | 17.04 |
| Віцебск — | 4.22 | 21.43 | 17.21 |
| Магілёў — | 4.31 | 21.35 | 17.04 |
| Гомель — | 4.37 | 21.22 | 16.45 |
| Гродна — | 4.58 | 21.58 | 17.00 |
| Брэст — | 5.08 | 21.50 | 16.42 |

**Месяц**

***Першая квадра 27 чэрвеня. Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

**Імяніны**

***Пр.** Майсея, Міхаіла, Пятра, Ціхана.*
***К.** СВ. АПОСТАЛАЎ ПЯТРА І ПАЎЛА, Саламеі, Францішка.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

Ад любові да нянавісці адзін гол.

**— Матуля, можна я вазьму яшчэ адзін кавалачак торта?**
**— Ды еш хоць увесь! Толькі палову мне пакінь.**

З гутарак у настаўніцкай:
— Сідараў як вучань — так сабе. Але як крыніца даходаў — вельмі стабільны.

**У адэскім цырку фокуснік, які прыехаў з гастролямі трупы, са шчырым здзіўленнем дастаў з кішэні гледача не голуба і труса, а ўласны кашалёк.**

Студэнты.
— А фізіялогію рэальна спісаць?
— Не, там сочаць пільна.
— А калі з мікранавушнікам прыйду?
— Летась Саня спісваў — ну той, які ў арміі цяпер.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 2795.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 28 чэрвеня 2012 года.